З лепшага вопыту



# ЯК ПРЫВАБІЦЬ ЧЫТАЧА?

***Напярэдадні прафесійнага свята "БН" пабывала ў вясковых бібліятэках Міншчыны. Чым здольныя яны зацікавіць сучаснага чытача — спакушанага тэлебачаннем і Інтэрнэтам маладога вяскоўца і стомленага нялёгкай працай чалавека сталага?***

Бясспрэчна, сельскія бібліятэкі адрозніваюцца ад гарадскіх. Ды і як жа інакш, калі бібліятэка для вяскоўца — сапраўдны культурны цэнтр, а яе работнікі асабіста ведаюць кожнага свайго чытача. І прыходзяць сюды наведвальнікі не толькі для таго, каб узяць кнігу ці часопіс...

Ёсць у вёсцы Крупіца прыгожы трохпавярховы будынак з велічнымі калонамі і вялікімі светлымі вокнамі. Вакол квітнеюць клумбы, радуюць вока дарожкі, выкладзеныя пліткай, а шырокі ганак гасцінна запрашае зайсці. Гэта мясцовы Цэнтр культуры, у якім кожны можа знайсці занятак па душы: спевы, маляванне, танцы... Месціцца тут і Крупіцкая бібліятэка-музей.

У адным пакоі прадстаўлены цікавыя экспанаты, якія збіраліся на працягу многіх гадоў: рэчы сялянскага жыцця і побыту, прылады працы, абутак, арыгінальныя фотаздымкі мінулых стагоддзяў. Стэнд, прысвечаны Вялікай Айчыннай, дэманструе газеты, якія выходзілі ў ваенныя гады, фотакарткі, лісты салдатаў да родных. Экспазіцыя "Нашы славутыя землякі" — гэта фотаздымкі і біяграфіі знакамітых людзей Беларусі, якія нарадзіліся і выраслі на гэтай багатай на таленты зямлі. Мяркуйце самі, якія гучныя імёны: Уладзімір Карызна, Фёдар Пастарнацкі, Іван Грамовіч, Віктар Грыб.

Менавіта бібліятэка займае ўсяго адзін пакой, але да паслуг чытачоў мае літаратуру самых розных напрамкаў. Тут і класіка, і дэтэктывы, і прыгоды, і жаночыя раманы. Асаблівым попытам карыстаюцца перыядычныя выданні, бо вяскоўцы не могуць аформіць падпіску на ўсе газеты і часопісы, якія хацелася б пачытаць. Да наведвальнікаў тут заўсёды ставяцца з асаблівай увагай і добразычлівасцю, таму і чытачоў бібліятэка мае багата. Але не толькі гэтым прываблівае яна людзей.

Пры Крупіцкай бібліятэцы працуюць розныя аматарскія клубы. Пад кіраўніцтвам яе загадчыцы Людмілы Пальчык школьнікі вывучаюць гісторыю роднага краю ў клубе "Спадчына". Збіраюць мясцовы фальклор, знаёмяцца з традыцыямі і звычаямі. Сябры клуба наладжваюць сустрэчы, прысвечаныя беларускім асветнікам, бяруць актыўны ўдзел у арганізацыі і правядзенні святаў. Самыя буйныя і цікавыя — з народнага календара: Каляды, Масленіца, Купалле, Дажынкі.



Не пакідаюць без увагі і людзей сталага ўзросту. Для іх створаны клуб "Ветэран" пад кіраўніцтвам Святланы Высоцкай. З вялікім задавальненнем прыходзяць ветэраны на сустрэчы, выступаюць перад моладдзю, збіраюцца за кубкам гарбаты для гутаркі.

Адным словам, можна шчыра сказаць, што вяртаецца чытач у бібліятэку дзякуючы працы сапраўдных энтузіястаў, якія з натхненнем і зацікаўленасцю ставяцца да сваёй работы. Захапіць, прывабіць, аб'яднаць людзей стала для іх ужо ладам жыцця.

Сельская бібліятэка Астрашыцкага Гарадка размясцілася ў школе. Адзін пакой, які адведзены пад кніжную скарбніцу, настолькі добра арганізаваны, што пры невялікай плошчы змяшчае багаты кніжны фонд. У дапамогу вучням сабраны матэрыялы "Вялікія людзі ў сусветнай гісторыі". Часта карыстаюцца школьнікі і краязнаўчай інфармацыяй для падрыхтоўкі ўрокаў, дакладаў і проста для пашырэння ўласнага кругагляду.



Вялікая ўвага надаецца патрыятычнаму выхаванню школьнікаў і здароваму ладу жыцця. А для самых маленькіх пад кіраўніцтвам бібліятэкара Таццяны Шутковай працуе клуб "Лесавічок", які мае экалагічны накірунак. Да таго ж бібліятэка абсталявана сучасным камп'ютэрам і добрай мэбляй. Па прызнанні саміх чытачоў, яны прыходзяць сюды з задавальненнем, бо, акрамя таго, што могуць знайсці патрэбную літаратуру, адчуваюць увагу супрацоўнікаў і ўтульнасць, створаную для наведвальнікаў.

Як адзначыла дырэктар Мінскай раённай цэнтральнай бібліятэкі Галіна Казловіч, у хуткім часе бібліятэкі Міншчыны чакаюць прыемныя перамены. Некаторыя з іх атрымаюць новую прапіску, іншыя — сучасную тэхніку і абсталяванне. І, зразумела, фонды кожнай бібліятэкі папоўняцца новымі выданнямі. А мы, чытачы, з удзячнасцю і нецярпеннем будзем чакаць ажыццяўлення гэтых планаў.

**Кацярына ХАДАСЕВІЧ-ЛІСАВАЯ.**

**НА ЗДЫМКАХ:** ***Крупіцкі цэнтр культуры; наведвальнікі Крупіцкай бібліятэкі-музея; экспазіцыя "З гісторыі краю".***

**Фота аўтара.**

**Мінская праўда . – 2007. – 15 верасня. – С.4.**